# ПЛАН-КАНСПЕКТ ВУЧЭБНАГА ЗАНЯТКА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “МАТЭМАТЫКА” Ў II КЛАСЕ ПА ТЭМЕ “ВУСНЫЯ ПРЫЁМЫ СКЛАДАННЯ І АДНІМАННЯ ДВУХЗНАЧНЫХ ЛІКАЎ У МЕЖАХ 100. ЗАМАЦАВАННЕ”

*Міхалоўская Галіна Дзмітрыеўна*

**Мэта:** замацаванне вывучаных прыёмаў вуснага складання і аднімання двухзначных лікаў у межах 100 без пераходу праз дзясятак.

**Задачы:**

замацаваць алгарытм вусных прыёмаў вылічэнняў вывучаных відаў;

адпрацаваць уменне рашаць задачы, чарціць ломаную;

стварыць умовы для развіцця пазнавальных працэсаў: лагічнага мыслення, увагі, памяці, уважлівасці і мовы;

развіваць навыкі самаправеркі і ўзаемаправеркі;

фарміраваць практычныя навыкі выкарыстання матэматычных ведаў і ўменняў, неабходных у паўсядзённым жыцці

**Тып урока:** урок замацавання.

**Форма правядзення ўрока:** урок-гульня[2].

**Абсталяванне:** падручнік[2], карткі з прыкладамі для работы ў парах, карткі з умовамі заданняў, картка «Траекторыя палёту дрона», дрон-раскраска, прэзентацыя (дадатак).

### Ход вучэбнага занятка

**I. Арганізацыйны этап.**

*Настаўнік звяртаецца да вучняў.*

*Празвінеў ужо званок,*
*Пачынаем мы ўрок!*
*Моўчкі ўсе за парты селі,*
*На гасцей усе паглядзелі,*
*Усміхнуліся, павярнуліся*
*І ў працу акунуліся!*

**II. Этап праверкі дамашняга задання.**

Узаемаправерка №1, 2 с. 93.

**III. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.**

Сёння ў нас не проста ўрок матэматыкі, а ўрок-гульня. Хачу паведаміць вам даволі цікавую навіну. На маю інтэрнэт-старонку паступіла паведамленне ад супрацоўнікаў міліцыі. Паслухайце яго: “Дарагія сябры! Нам, супрацоўнікам міліцыі, стала вядома, што вы добра ведаеце матэматыку. Без памылак выконваеце вылічэнні, рашаеце розныя тыпы задач. Вы вельмі кемлівыя, уважлівыя, адказныя! Нам вельмі хочацца, каб вы паказалі свае веды. За добра выкананыя заданні вы атрымаеце пасведчанне “Сапраўдны памочнік міліцыянера”. З павагай, супрацоўнікі міліцы”.

Ну што, сябры, пакажам супрацоўнікам міліцыі свае веды? *(Так).*

Спачатку давайце высветлім, хто такі міліцыянер? Чым ён займаецца? *(Міліцыянер – прадстаўнік праваахоўных органаў, які забяспечвае ахову грамадскага парадку, абарону грамадзянскіх правоў і барацьбу са злачыннасцю. Міліцыянер забяспечвае грамадскую бяспеку, ажыццяўляе патруляванне тэрыторыі, рэагуе на парушэнні грамадскага парадку і злачынствы, а таксама ўзаемадзейнічае з грамадзянамі для прадухілення злачынстваў і аказання дапамогі ў надзвычайных сітуацыях).*

Якімі якасцямі ён павінен валодаць? *(Ён павінен быць дужым, разумным, адказным, уважлівым і г.д.)*

Правільна, добры міліцыянер павінен мець зоркае вока, умець чуць і слухаць, быць уважлівым. Усе гэтыя якасці і спатрэбяцца нам на ўроку. А якія яшчэ ёсць прафесіі, падобныя на прафесію міліцыянера? *(Юрыст, адвакат, суддзя і г.д.)*

І ваша задача – уважліва слухаць, адказываць на пытанні і правільна выконваць заданні, выкарыстоўваючы прыёмы складання і аднімання двухзначных лікаў у межах 100.

Давайце паглядзім, якая тэма сённяшняга ўрока.

Тэма ўрока – “Вусныя прыёмы складання і аднімання двухзначных лікаў у межах 100. Замацаванне”. Задачы ўрока – замацаваць уменне складваць і аднімаць двухзначныя лікі ў межах 100; чарціць і знаходзіць даўжыню ломанай, рашаць задачы.

А ў канцы ўрока даведаемся, хто з вас атрымае званне “Сапраўдны памочнік міліцыянера”.

Але спачатку паглядзіце, што вы бачыце на парце перад сабой на лістках паперы?

*На адным лістку паперы картка “Траекторыя палёту дрона” (дадатак), дзе змешчаны ўсе заданні, якія прапануюць супрацоўнікі міліцыі для выканання на ўроку,на другім – дрон-раскраска (Малюнак 1).*

Што такое дрон? *(Беспілотны лятальны апарат).*



Малюнак 1

[1]Формы работы: франтальная, групавая, работа ў парах, індывідуальная; метады і прыёмы: славесны (гутарка, лаканічная даведка, тлумачэнне), наглядны (карта-схема), праблемны (праблемнае пытанне), практычны (выкананне заданняў).

[2]Мураўёва, Г.Л. Матэматыка: вучэбны дапаможнік для 2 класа: у 2 ч. / Г.Л. Мураўёва, М.А. Урбан. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – Ч. 1. – 2020. – 136 с.

Для чаго яны выкарыстоўваюцца? Якія яны бываюць? *(Меркаванні дзяцей).*

У вас, дзеці, дрон будзе памочнікам. Вышыня яго палёту будзе вызначацаць якасць выканання вашага задання. Калі заданне выканана правільна, ваш дрон будзе лётаць у самым версе слупка. Там вы будзеце ставіць кропачку і г.д.

**IV. Актуалізацыя суб'ектнага вопыту навучэнцаў.**

А спачатку супрацоўнікі міліцыі прапануюць правесці планёрку, каб праверыць вашы веды, ці праўдзівыя і сумленныя вы як памочнікі міліцыянера. І гэта мы зробім з дапамогай прыбора, аб якім вы ўжо ведаеце, «дэтэктара хлусні».

4.1. Вуснае лічэнне «Дэтэктар хлусні».

Пачнем, першае заданне на ўважлівасць. Вы павінны адказаць на мае пытанні. Калі гэтае сцвярджэнне правільнае, то ставім знак «+», калі неправільнае — «−». *(Дзеці самастойна запаўняюць карткі).*

1. Лікі пры аднімання называюцца памяншаемае, аднімаемае, рознасць. *(+)*
2. Самы вялікі двухзначны лік — гэта 99. *(+)*
3. Самы маленькі адназначны лік — гэта 100. *(–)*
4. 100 − 40 = 60. *(+)*
5. Памяньшаемае 47, аднімаемае 5. Рознасць — 42. *(+)*
6. Лікі пры адніманні называюцца: 1 складаемае, 2 складаемае, сума. *(–)*
7. Сума лікаў 50 і 3 — гэта 53. *(+)*
8. Ломаная складаецца толькі з 2 звёнаў. *(–)*
9. Калі лік 40 павялічыць на 30, то атрымаецца 70. *(+)*
10. 1 м — гэта 100 см. *(+)*

Выконваем самаправерку і ўзаемаправерку (у парах). Правяраем па табліцы.

Хто выканаў правільна без памылак? Ацаніце сябе. На якой вышыні апынуўся ваш дрон?

*Дзеці ацэньваюць сябе па картцы "Траекторыя палёту дрона".*

Вы паказалі сябе як кэмпетэнтныя супрацоўнікі міліцыі. Працягваем нашу работу. Гатовы? *(Так).*

4.2. Заданне 1. "Маршруты нашых супрацоўнікаў"[3].

Каб даведацца, які маршрут будзе ў нашых супрацоўнікаў, трэба начарціць ломаную з некалькіх звёнаў.

Працуем з заданнем №1 на с. 94 у падручніку.

Чаму маршруты атрымаліся розныя? *(Ломаную можна чарціць у розных напрамках).*

*Кожная пара ацэньвае сваю работу.*

Маршрут пабудаваны. У добры шлях!

3.3. Заданне 2. «Шыфроўка».

Зараз праверым вашы вылічальныя навыкі па матэматыцы з дапамогай задання, якое называецца «Шыфроўка».

Вы будзеце працаваць самастойна. Вам неабходна рашыць прыклады, напісаць адказы ў картках ў парадку памяншэння для таго, каб атрымалася слова.

| | | |
|---|---|---|
| а | 56 + 4 | 60 |
| з | 99 − 5 | 94 |
| к | 50 + 8 | 58 |
| о | 40 + 5 | 45 |
| н | 20 − 17 | 3 |

Давайце праверым, ці правільна вы выканалі заданне.

Падыміце рукі, ў каго няма памылак. Якое слова атрымалася? *(Закон).*

Ацаніце сябе. На якой вышыні знаходзіцца ваш дрон?

Што такое закон? *(Важнае правіла, якое ўсе абавязаны выконваць; правілы, якія ўсталёўвае дзяржава. Іх павінны выконваць усе грамадзяне нашай краіны.)*

Як называецца кніга, дзе змешчаны галоўныя законы нашай краіны? *(Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь).*

А хто з'яўляецца кіраўніком нашай дзяржавы? *(Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь).*

А як вы лічыце, гэта прафесія? *(Так).*

Якімі якасцямі павінен валодаць чалавек гэтай прафесіі? *(Меркаванні дзяцей).*

Малайцы! Яшчэ з адным заданнем справіліся. Ацаніце сябе, калі ласка.

Не сакрэт, што ў добрага міліцыянера павінна быць выдатная фізічная падрыхтоўка. Правядзем фізкультхвілінку.

4.3. Фізкультхвілінка: відэакліп "Бульба-дэнс" (дадатак).

Скажыце, людзей якіх прафесій, вы бачылі на відэаролікy? *(Прэзідэнт, спартсмен, повар, тэлевядучы і г.д.).*

Якая з гэтых прафесій самая галоўная? *(Усе).*

4.4. Заданне 3 "Аддзел статыстыкі"[4].

Міліцыянеры павінны не толькі ўмець правільна лічыць, але і працаваць з дакументамі, рашаць задачы. Прачытайце ўважліва задачу і рашыце яе.

Задача. У адным раённым аддзеле ўнутраных спраў працуе 27 міліцыянераў, а у другім — на 3 больш. Колькі міліцыянераў працуе ў другім аддзеле?

Раскажыце ўмову задачы. На якое пытанне трэба знайсці адказ?

Што абазначаюць лікі ў задачы?

*Вучні рашаюць задачу самастойна, па жаданні — у парах, адзін вучань рашае ля дошкі. Затым правяраюць яе рашэнне.*

Работа міліцыянера — эта праца не толькі з дакументамі, пошукі, але і праца за камп'ютарамі, таму прапаную зняць стомленасць з вачэй.

4.5. Фізкультхвілінка для вачэй.

*Улева — управа, улева — управа,*
*Вочкі бегаюць цікава.*
*Уверх-уніз, уверх-уніз,*
*Ну-ка, ўдалячынь углядзісь!*

4.6. Заданне 4 "Падбяры ключык"[5].

Для паспяховай работы супрацоўнікам неабход-

[3]Работа ў парах.
[4]Работа ў парах.
[5]Работа на камп'ютарах ў групах.

на зладжаная праца ўсёй каманды. Давайце выканаем яшчэ адно заданне «Падбяры ключык». Ваша задача — падабраць ключык да дзвярэй. Супрацоўнікі міліцыі жадаюць высветліць, хто з вас самы уважлівы (малюнак 2).



Малюнак 2

4.7. Заданне 5 "Дапамажы бабулі Алене".

Міліцыянеры рашаюць многа розных спраў. Шукаюць нават жывёл. Бабуля Алена папрасіла дапамогі нават і ў такой цікавай справе.

Рыжая, белая, шэрая кошкі набедакурылі на кухні. Знойдзены: аб'едзеная каўбаса, пустая бутэлька з-пад малака, разбітая банка варэння. Хто перакуліў слоік з варэннем, калі вядома, што ў шэрай кошкі ўсе вусы ў малацэ, а белая каўбасу не ела. Звярніце увагу на тое, што кожная з і іх нашкодзіла толькі адзін раз. Дакажыце?

Сапраўдны памочнік міліцыянера павінен валодаць добра развітым лагічным мысленнем. Ацаніце, на якім узроўні вы валодаеце лагічным мысленнем[6].

**V. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

Каб яшчэ ўпэўніцца у тым, што вы з'яўляецеся сапраўднымі памочнікамі міліцыянераў, я вам прапаную выканаць наступнае дамашняя заданне на с. 95 №1, 2.

*Дзеці самастойна ў пары высвятляюць, што трэба зрабіць дома пры выкананні дамашняга задання. Настаўнік па неабходнасці растлумачвае.*

**VI. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія.**

Супрацоўнікі міліцыі ўважліва назіралі за вашай працай. Як вы думаеце, як яны змаглі гэта зрабіць? *(Спутнікі, відэакамера, дроны і г.д.)*

Давайце ўспомнім, якія мы мэты ставілі ў пачатку ўрока?

Падвядзем вынікі праведзенай працы.

Ці атрымалася ў вас выканаць заданні? *(Так).*

Давайце паглядзім, на якой вышыні лятаў ваш дрон?

А які зараз у вас настрой? Расфарбуйце свой дрон адпаведным колерам[7].

Уявіце, што наша дошка — гэта неба. Размясціце на ёй вашы дроны, Пакажыце, на якую вышыню яны падняліся. Чаму?

*Кожны вучань атрымлівае пасведчанне "Сапраўдны памочнік міліцыянера".*

Каму спадабалася быць памочнікам міліцыянера?

Хто жадае стаць сапраўдным міліцыянерам?

Я жадаю вам стаць тым, кім вы марыце, але памятайце, што самая галоўная прафесія — быць чалавекам!

Дадатак

**QR-код доступу да прэзентацыі**

**QR-код доступу да відэакліпа фізкультхвілінкі**

6

| | Белая кошка | Шэрая кошка | Рыжая кошка |
|---|---|---|---|
| **Малако** | - | + | - |
| **Каўбаса** | - | - | + |
| **Варэнне** | + | - | - |

7Зялёны — вельмі добры настрой, жоўты — звычайны настрой, чырвоны — не вельмі добры настрой.

**Шаблон карткі**

| Траекторыя палёту дрона | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Вуснае лічэнне | Заданне №1 | Заданне №2 | Заданне №3 | Заданне №4 | Заданне №5 |
| «Дэтэктар хлусні» | «Маршруты нашых супрацоўнікаў» | «Шыфроўка» | «Аддзел статыстыкі» | «Падбяры ключык» | «Дапамажы бабулі Алене» |
| | | | | | |

*Дата поступления в редакцию: 18.04.2025*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ ВУЧЭБНАГА ЗАНЯТКА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ "НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ" (НАВУЧАННЕ ЧЫТАННЮ) У І КЛАСЕ ПА ТЭМЕ "ЗАМАЦАВАННЕ ВЫВУЧАНАГА МАТЭРЫЯЛУ. ЧЫТАННЕ СЛОЎ З ЛІТАРАЙ *Б*"

*Рабчаева Алена Іванаўна*

**Мэта** – абагульненне ведаў вучняў пра вывучаныя літары і гукі, іх характарыстыкі.

**Задачы:**

замацоўваць уменне чытаць склады і словы з літарай *Б/б* на аснове асвоеных вучнямі спосабаў дзеянняў;

арганізаваць назіранні за парнымі звонкімі / глухімі гукамі [б] – [п], [б'] – [п'];

садзейнічаць узнікненню ў вучняў цікавасці да чытання тэксту пра бабулю, дапамогу ёй і клопат пра яе;

выхоўваць дысцыплінаванасць, культуру зносін у працэсе вучэбнага ўзаемадзеяння.

**Абсталяванне:** асноўны вучэбны дапаможнік[1], дадатковы вучэбны дапаможнік[2], малюнкі "мост" і "ручнік", выявы Бома і Біма, кошыкі, прадметныя малюнкі з выявай прадметаў, у якіх ёсць гукі [б] і [б'], карткі літар, складоў, апорныя словы да тэксту, рознакаляровыя лямпачкі для ацэнкі і рэфлексіі.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны этап.**

Празвінеў званок і змоўк,
Пачынаем мы ўрок.

З якім настроем пачынаем урок? У вас на партах ляжаць рознакаляровыя лямпачкі. Зялёная лямпачка абазначае цудоўны настрой, жоўтая – добры, спакойны, чырвоная – сумны. Падыміце лямпачку патрэбнага колеру. Будзем старацца працаваць так, каб ва ўсіх да канца ўрока быў цудоўны настрой.

**II. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.**

Паглядзіце на дошку.

Разгадайце рэбус.

Назавіце слова.




Хто такі памочнік? *(Той, хто памагае каму-небудзь у нейкай справе).*

А вас называюць памочнікамі? Хто і калі вас так называе? *(Адказы вучняў).*

Сёння мы з вамі замацуем веды пра вывучаныя літары і гукі, будзем чытаць словы, сказы і тэксты з імі. На ўроку пагаворым і прачытаем пра тых, хто прыходзіць на дапамогу іншым людзям.

А вы жадаеце стаць маімі памочнікамі?

**III. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

3.1. Паўтарэнне вывучаных літар.

Успомнім вывучаныя літары і гукі, якія яны абазначаюць. Звярніце ўвагу на карту горада літар (малюнак 1).

М., ідзі да дошкі, зараз ты будзеш маім памочнікам. Твая задача – выбраць вывучаную літару на карце горада літар, а задача астатніх – хорам назваць гукі, якія гэта літара абазначае.

А зараз я выбіраю літару, М. называе гукі. Астатнія, уважліва слухайце і пляскайце ў далоні, калі гукі названы правільна.

3.2. Замацаванне паняцця пра цвёрдыя і мяккія

[1]Свірыдзенка, В.І. Буквар: вучэбны дапаможнік для ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск, 2024. – 184 с.

[2]Свірыдзенка, В.І. Спадарожнік буквара: дапаможнік для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.І. Свірыдзенка, В.І. Цірынава. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2021. – 202 с.